ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ

Аддзел Прыроды і Народнай Гаспадаркі

# МАТАР'ЯЛЫ
# ДА ГЕОГРАФІІ І СТАТЫСТЫКІ
# БЕЛАРУСІ

Выдаваныя пад рэдакцыяй
проф. А. Смоліча
правадзейнага члена Інстытуту

ТОМ ПЕРШЫ

МЕНСК — 1928

INSTITUT FUR WEISSRUTHENISCHE KULTUR

Abteilung für Natur-und Volkswirtschaftskunde

# BEITRÄGE
# ZUR GEOGRAPHIE UND STATISTIK
# WEISSRUTHENIENS

Herausgegeben unter der Redaktion
von Prof. A. Smolitsch
wirklichem Mitgliede des Instituts

ERSTER BAND

MINSK — 1928

209057
Дзярж. біб. БССР

Друкарская работа выканана ў друкарні Інстытуту Беларускае Культуры.
Загадчык складальнага аддзелу Г. Л. Крэйнін.
*Мэтранпаж Э. Мэрамінскі.*
Друкар І. Шыманскі.
Карэктуру вялі: Н. В. Янчанка і Гурло.
Кліша прыгатаваны ў цынкографіі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.
Друкам распачаты гэты том у чэрвені, скончаны ў сьнежні 1928 году.

Дазваляецца выпусьціць у сьвет.
Неадменны Сакратар ІБК *В. Ластоўскі.*

Менск, Друкарня Інбелкульту. Зак. № 327. Галоўлітбел, № 1436. Тыр. 1000.

## ПРАДМОВА.

Спаміж дасягненьняў Беларусі, здабытых за апошняе дзесяцігодзьдзе, заслугоўвае адзначэньня адно, быць можа ня вельмі яскравае, але тым ня менш поўнае глыбокага сэнсу ў пэрспэктыве культурнае гісторыі краю. Я маю на ўвазе разьвіцьцё географічнага і статыстычнага самапазнаньня, якое цяпер ахапіла масы насяленьня Беларусі. Вось ужо некалькі гадоў, як на ўсёй прасторы Беларусі, па вёсках і мястэчках распачалася краязнаўчая праца, якая ў пераважнай большасьці мае географічны зьмест; статыстычнымі органамі зьбіраюцца і распрацоўваюцца лічбавыя матар'ялы ў такіх разьмерах, якіх ніколі ня бачыла Беларусь; стварыліся ўмовы, якія дазволілі вылучыцца новай галіне географічнае навукі—Географіі Беларусі. Апошняя цяпер стала адным з асноўных прадметаў выкладаньня ў школах усіх ступеняй да вышэйшых школ Беларусі ўключна. Гэты процэс географічнага самапазнаньня бясспрэчна стаіць у найцясьнейшай сувязі з тымі вымаганьнямі, якія ставіць навуцы эпоха рэволюцыі, эпоха соцыялістычнае перабудовы ўсяго конкрэтнага, вакольнага жыцьця. Для продукцыйнай працы ў гэтую эпоху асабліва неабходна самае тонкае разуменьне і выкарыстаньне ўсіх географічных асаблівасьцяй краю і кожнага яго раёну, а па магчымасьці і кожнае мясцовасьці.

Але адно зьбіраньне географічнага і статыстычнага матар'ялу ёсьць толькі пачаткам гэтае важнае справы, які патрабуе свайго лёгічнага працягу,—распрацоўкі, сыстэматызацыі і апублікаваньня ўсіх вартых таго матар'ялаў. З гэтага боку застаецца яшчэ шмат працы для выкананьня. Статыстычныя матар'ялы распрацоўваюцца і публікуюцца толькі ў вельмі амбежаваных рамках, з мэтаю пераважна даць пэўныя сярэднія лічбы па ўсёй Беларусі і па яе найбуйнейшых падзелках—акругах. Найцікавейшы для географа матар'ял аб дробных тэрыторыяльных адзінках, аб паасобных паселішчах звычайна не публікуецца, дый наўрад ці можа быць апублікаваны ў поўнай меры, дзякуючы сваёй грамознасьці. Тое самае можна ў яшчэ большай меры сказаць аб географічным матар'яле, зьбіраным краяведамі. Усе гэтыя матар'ялы пакуль што неабходна выкарыстоўваць для навуковых географічных прац у сырым відзе, публікуючы, аднак, разам з працамі і больш каштоўныя з выкарыстаных сыстэматызаваных матар'ялаў, каб даць магчымасьць шырэйшым колам дасьледчыкаў як спраўдзіць вывады кожнае працы, так і дапажыць сваіх высілкаў для далейшага дасьледваньня таго самага матар'ялу іншымі мэтодамі, з іншых пунктаў пагляду.

*Катэдра Географіі Інстытуту* Беларускае Культуры, распачынаючы выданьне „Матар'ялаў да Географіі і Статыстыкі Беларусі" мае на ўвазе публікаваць у іх працы пераважна монографічнага характару,

пабудаваныя на шырокім выкарыстаньні сырога матар'ялу, які часткаю таксама будзе публікавацца ў дадатках. Такім сырым матар'ялам, па сутнасьці, для географа зьяўляецца і канчатковая публікацыя статыстычнага матар'ялу. Каб зрабіцца гатовым географічным матар'ялам ён павінен быць ня толькі разьмешчаны па гоеграфічнай карце, але ў кожным пункце гэтае карты павінен быць увязаны з цэлым шэрагам географічных элемэнтаў у суцэльнай характарыстыцы географічнага раёну.

Катэдра географіі мае сваім заданьнем географічную распрацоўку ўсіх пералічаных матар'ялаў, якая павінна з усёй масы іх выбраць тыя, што маюць географічнае значэньне і ў належнай меры характарызуюць раён, да якога адносяцца. Атрыманы ў выніку гэтага адбору географічны матар'ял будзе ўжо трывалым і пэўным фундамэнтам, на якім будзе разьвівацца географія Беларусі.

У 1-м томе „Матар'ялаў" зьмяшчаюцца працы, пабудаваныя на статыстычным матар'яле, што тлумачыцца як тым, што гэты матар'ял ужо даўно чакае навуковага выкарыстаньня, так і яго большай даступнасьцю, паўнатой і аднастайнасьцю зьбіраньня, што дазваляе асьвятліць адразу некаторыя шырокія проблемы з належнай гарантыяй упэўненасьці. У далейшых томах „Матар'ялаў" зьявяцца працы пабудаваныя на даных, зьбіраных краязнаўчымі організацыямі, а таксама і самой Катэдрай Географіі, ды іншымі катэдрамі Інстытуту праз іхнія экспэдыцыі.

Было-б вельмі пажадана, каб у навуковай распрацоўцы абшырнага географічнага і статыстычнага матар'ялу аб Беларусі прынялі ўдзел магчыма шырэйшыя колы дасьледчыкаў-географаў і статыстыкаў. Супольнымі высілкамі нам трэба дабіцца, каб посьпехі географічнага самапазнаньня Беларусі былі замацаваны глыбокімі навуковымі падставамі і каб яны як найхутчэй прынесьлі справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва Беларусі тую карысьць, якой ад іх можна спадзявацца.

А. Смоліч.